Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
_____________ В. Р. Языковіч
«___» ____________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭКОЛАГА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01 14-2013 па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, рэг. № Е 23-1-75/17 вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Н. У. Самерсава,* прафесар кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*С. Б. Майсяйчук,* прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*А. Ч. Сізова,* намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Ветразь"» г. Мінска

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 28.03.2018);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 19.04.2018)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н. У. Самерсава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Эколага-культурная дзейнасць» распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць. Прапанаваная вучэбная праграма з'яўляецца лагічным працягненнем і паглыбленнем ведаў, атрыманых студэнтамі ў выніку авалодання такімі дысцыплінамі, як «Сацыяльна-культурная дзейнасць», «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці» і інш.

Вывучэнне дадзенай вучэбнай дысцыпліны дапамагае студэнтам усвядоміць значнасць экалагічнай праблематыкі на сучасным этапе сацыяльна-культурнага развіцця не толькі ў межах нашай краіны, але і планетарнага развіцця наогул. Сёння становіцца ўсе больш відавочным, што вырашэнне экалагічных праблем залежыць ад таго, якімі маральнымі каштоўнасцямі карыстаецца чалавек у сваіх узаемаадносінах з навакольным асяроддзем, ад узроўню яго адукацыі і выхавання, яго экалагічнай свядомасці і культуры.

Фарміраванне культуры экалагічных зносін залежыць ад мэтанакіраванай эколага-культурнай дзейнасці як аднаго з найважнейшых напрамкаў сацыяльна-педагагічнай работы.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01-2013 па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць» студэнты павінны набыць наступныя акадэмічныя кампетэнцыі:

АК-2 – Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

АК-3 – Валодаць даследчымі навыкамі;

АК-5 – Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

Наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

САК-1 – Валодаць якасцямі грамадзянскасці;

САК-4 – Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

Наступныя прафесійныя кампетэнцыі:

ПК-1 – Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, захавання і распаўсюджання каштоўнасцей культуры;

ПК-2 – Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-6 – Уключаць людзей у працэс бесперапыннай адукацыі, сацыяльна-культурнай творчасці і рэкрэацыйна-забаўляльнага вольнага часу;

ПК-8 – Набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі;

ПК-11 – Выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбнасці насельніцтва ў розных відах вольнага часу.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – засвоіць тэарэтыка-метадычныя асновы эколага-культурнай дзейнасці, сфарміраваць у студэнтаў прадстаўленні аб прымяненні тэарэтычных палажэнняў і практычных метадаў дзейнасці экалагічнага напрамку ва ўстановах сацыякультурнай сферы.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– вызначыць сутнасць і змест эколага-культурнай дзейнасці як значнай часткі сацыяльна-педагагічнага працэсу;

– выявіць спецыфіку дзейнасці сацыякультурных устаноў у сістэме бесперапыннай экалагічнай адукацыі і выхавання насельніцтва;

– даследаваць ролю і асаблівасці нацыянальнай беларускай спадчыны ў эколага-культурнай дзейнасці;

– высветліць і прааналізаваць псіхолага-педагагічны патэнцыял прыроды і яго ўздзеянне на чалавека;

– распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі эколага-культурнай дзейнасці ва ўстановах сацыякультурнай сферы.

У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– сутнасць і асноўныя прынцыпы сацыякультурнай дзейнасці экалагічнага напрамку;

– арганізацыйна-метадычныя асновы эколага-культурнай дзейнасці;

– псіхолага-педагагічныя функцыі ўзаемаадносін чалавека і прыроды;

– асаблівасці выкарыстання нацыянальнай беларускай спадчыны ў эколага-культурнай дзейнасці.

Студэнты павінны *ўмець*:

– растлумачыць ролю спецыяліста сацыякультурнай дзейнасці ў фарміраванні экалагічнай культуры насельніцтва;

– ахарактарызаваць формы, сродкі і метады эколага-культурнай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– прааналізаваць асаблівасці нацыянальнага кампанента ў змесце эколага-культурнай дзейнасці.

Студэнты павінны *валодаць*:

– асноўнымі паняццямі і тэхналогіямі дысцыпліны «Эколага-культурная дзейнасць»;

– навыкамі планавання комплексных эколага-культурных праграм і іх рэалізацыі ва ўстановах сацыякультурнай сферы.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Эколага-культурная дзейнасць» усяго прадугледжана 92 гадзіны, з якіх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 10 гадзін – лекцыі, 12 гадзін – семінарскія заняткі, 12 гадзін – лабараторныя заняткі.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Тэма 1. Уводзіны. Сутнасць і асноўныя функцыі эколага-культурнай дзейнасці*

Эколага-культурная дзейнасць як многааспектная сацыяльная з'ява і значны напрамак у дзейнасці ўстаноў сацыякультурнай сферы. Функцыі эколага-культурнай дзейнасці: рэкрэацыйна-аздараўленчая, адукацыйна-развіваючая, інфармацыйна-асветніцкая, адаптыўна-нарматыўная, камунікатыўная, культурна-творчая. Экалагічная культура як аб'ект сацыяльна-педагагічных і сацыякультурных даследаванняў.

### *Тэма 2. Роля нацыянальнага кампанента ў змесце эколага-культурнай дзейнасці*

Славянскія традыцыі прыродакарыстання. Асаблівасці земляробчага календара беларусаў і яго ўплыў на развіццё ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Тэма прыроды ў беларускай святочна-абрадавай дзейнасці, музычна-песеннай творчасці, народных казках і легендах, прыкладах малога размоўнага жанру (прыказках, прымаўках, загадках). Сучасная практыка выкарыстання багаццяў жыватворнай вусна-паэтычнай спадчыны ў эколага-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 3. Роля ўстаноў сацыякультурнай сферы ў арганізацыі эколага-культурнай дзейнасці*

Установы сацыякультурнай сферы як цэнтры экалагічнай адукацыі і выхавання насельніцтва. Класіфікацыя ўстаноў сацыякультурнай сферы ў кантэксце арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці экалагічнага напрамку. Асаблівасці арганізацыі эколага-культурнага працэсу ў навукова-асветніцкіх і культурна-адпачынкавых установах. Сучасныя даследаванні дзейнасці ўстаноў культуры ў галіне эколага-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 4. Фарміраванне экалагічнай культуры асобы ў тэорыі і практыцы сацыякультурнай дзейнасці*

Гісторыка-метадалагічныя аспекты станаўлення і развіцця экалагічнай праблематыкі ў тэорыі і практыцы сацыяльна-культурнай дзейнасці. Тэарэтыка-метадычныя асновы фарміравання экалагічнай культуры асобы ў працэсе сацыякультурнай дзейнасці. Структурна-змястоўны аналіз паняцця «экалагічная культура асобы».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Выкарыстанне педагагічнага патэнцыялу сацыякультурнай дзейнасці ў працэсе фарміравання экалагічнай культуры асобы*

Эколага-культурная дзейнасць як педагагічная сістэма. Суб'ект, аб'ект, прадмет эколага-культурнай дзейнасці. Асноўныя сродкі і метады эколага-культурнай дзейнасці. Педагагічны патэнцыял сродкаў мастацтва і яго выкарыстанне ў эколага-культурным працэсе. Класіфікацыя форм эколага-культурнай дзейнасці. Арганізацыя дзейнасці клубных аб'яднанняў эколага-культурнага напрамку.

### *Тэма 6. Фарміраванне эколага-культурнай кампетэнтнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы*

Сучасны стан экалагічнай падрыхтоўкі арганізатараў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сутнасць, крытэрыі і паказчыкі эколага-культурнай кампетэнцыі спецыяліста сацыякультурнай сферы. Навукова-тэарэтычныя і метадычныя асновы фарміравання эколага-культурнай кампетэнцыі. Асаблівасці работы спецыяліста сацыякультурнай сферы па арганізацыі дзейнасці клубнага аб'яднання экалагічнага напрамку.

### *Тэма 7. Дыферэнцыраваны падыход да аўдыторыі ў працэсе арганізацыі эколага-культурнай дзейнасці*

Сацыяльна-педагагічныя асновы дыферэнцыяцыі аўдыторыі ўстаноў культуры ў кантэксце арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці экалагічнага напрамку. Улік узроставых і псіхолага-педагагічных асаблівасцей дзяцей і моладзі ў працэсе эколага-культурнай дзейнасці. Асаблівасці арганізацыі і правядзення дыягностыкі ўзроўняў экалагічнай культуры дзяцей і падлеткаў ва ўстановах сацыякультурнай сферы.

### *Тэма 8. Арганізацыйна-метадычныя аспекты эколага-культурнай дзейнасці*

«Гульнявая экалогія» як сродак аптымізацыі эколага-культурнай дзейнасці. Методыка «адчуванне цуду» ў развіцці пачуццёвага ўспрымання прыроды. Экалагічныя казкі: асаблівасці і магчымасці выкарыстання ў эколага-педагагічным працэсе. Методыка арганізацыі і правядзення экалагічных свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Кіруемая самастойная работа | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | | |
| 1 | Уводзіны. Сутнасць і асноўныя функцыі эколага-культурнай дзейнасці | 2 | 2 | | | |
| 2 | Роля нацыянальнага кампанента ў змесце эколага-культурнай дзейнасці | | 2 | | | |
| 3 | Роля ўстаноў сацыякультурнай сферы ў арганізацыі эколага-культурнай дзейнасці | 2 | 2 | | | |
| 4 | Фарміраванне экалагічнай культуры асобы ў тэорыі і практыцы сацыякультурнай дзейнасці | 2 | 2 | | 2 | вуснае апытанне |
| 5 | Выкарыстанне педагагічнага патэнцыялу сацыякультурнай дзейнасці ў працэсе фарміравання экалагічнай культуры асобы | 2 | 2 | | 2 | рэферат |
| 6 | Фарміраванне эколага-культурнай кампетэнтнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы | | | 4 | | |
| 7 | Дыферэнцыраваны падыход да аўдыторыі ў працэсе арганізацыі эколага-культурнай дзейнасці | | | 2 | | |
| 8 | Арганізацыйна-метадычныя аспекты эколага-культурнай дзейнасці | | | 4 | 2 | прэзентацыя |
| | **Усяго…** | **8** | **10** | **10** | **6** | **экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Беляева, Е. В.* Экологическая культура студенческой молодежи: опыт социологического анализа в вузах Беларуси / Е. В. Беляева // Основы экологической этики : учеб. пособие. – Минск : МГЭУ им. А. Д. Сахарова, 2008. – С. 67–80.

2. *Дерябо, С. Д.* Экологическая педагогика и психология : учеб. пособие для вузов / С. Д. Дерябо, В. А. Ясвин. – Ростов н/Д : Феникс, 1996. – 477 с.

3. *Дорошко, О. М.* Экологическая культура: педагогический аспект / О. М. Дорошко. – Гродно : ГрГУ, 2001. – 234 с.

4. *Кашлев, С. С.* Экологическая культура: сущность, содержание, технологии формирования / С. С. Кашлев // Народная асвета. – 2005. – № 2. – С. 33–37.

5. *Павлов, А. Н.* Основы экологической культуры : учеб. пособие для студентов вузов, преподавателей средних школ и учащихся старших классов / А. Н. Павлов. – СПб. : Политехника, 2004. – 332 с.

6. *Рудянская, Е. И.* Формирование экологического мировоззрения у студентов гуманитарного вуза / Е. И. Рудянская // Актуальные проблемы общественных наук и творческих профессий (философия, история, социология, культура, искусство, религия) : сб. ст. / редкол.: В. К. Крючек (отв. ред.) [и др.]. – Волгоград : Изд-во ВолГУ, 2005. – С. 301–306.

7. *Самерсова, Н. В.* Воспитание в процессе экологической деятельности : пособие для педагогов социальных, классных руководителей, воспитателей, специалистов системы внешкольного воспитания и обучения / Н. В. Самерсова. – Минск : Беларус. навука, 2005. – 229 с.

8. *Самерсова, Н. В.* Педагогические условия формирования экологической культуры личности : метод. рек. для руководителей кружков и эколог. клубов / Н. В. Самерсова ; М-во образования Респ. Беларусь ; УО «Республиканский экологический центр детей и юношества». – Минск : ООО «Мэджик Бук», 2007. – 64 с.

9. *Самерсова, Н. В.* Шестой школьный день – «в объятиях» природы / Н. В. Самерсова // Народная асвета. – 2017. – № 5. – С. 32–34.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Самерсова, Н. В.* Экологическая культура личности: социокультурный аспект / Н. В. Самерсова. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – 284 с.

*11.* Формирование экологической культуры и развитие молодежного движения / под ред. В. М. Захарова. – М. : Акрополь : Центр экологической политики и культуры : Центр экологической политики России, 2008. – 340 с.

*Дадатковая*

*1. Водопьянов, П. А.* Стратегия будущего и приоритеты современной экологической политики / П. А. Водопьянов // Роль кинематографа, телевидения и СМИ в формировании экологического мировоззрения: материалы Междунар. экологического кинотелефорума стран Центрального, Восточно-Европейского региона и Балтии «Экомир», Минск, 5–7 июня 2006 г. – Минск, 2007. – С. 18–21.

*2. Глазачев, С. Н.* Экопедагогика: взгляд в будущее / С. Н. Глазачев // Вестн. МГОПУ им. М. А. Шолохова. Сер. Экопедагогика. – М., 2006. – С. 3–6.

*3. Данилов-Данильян, В. И.* Экологический вызов и устойчивое развитие / В. И. Данилов-Данильян, К. С. Лосев. – М., 2000. – 416 с.

*4. Калинин, В. Б.* Устойчивое развитие. Игры и упражнения : материалы к тренингам / В. Б. Калинин, Т. Д. Гайворон. – Обнинск : АсЭкО, 2002. – 56 с.

*5. Когай, Е. А.* Экологическая парадигма культуры и образования / Е. А. Когай // Социально-гуманитарные знания. – 2000. – № 4. – С. 114–129.

*6. Нуризянов, Р. М.* Развитие экологической культуры в процессе формирования личностных качеств студентов / Р. М. Нуризянов // Многоуровневое профессиональное образование в контексте Болонского процесса : материалы Всерос. науч.-практ конф., Казань, 26–27 мая 2005 г. / науч. ред.: Д. М. Шакирова [и др.]. – Казань : Новое знание, 2005. – 360 с.

*7. Шульженко, А. К.* Теоретические подходы к воспитанию эколого-эстетической культуры молодежи в современной европейской педагогике / А. К. Шульженко // Вестн. МГПУ им. М. А. Шолохова. Сер. Экопедагогика. – 2006. – № 4. – С. 59–60.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і рэалізуецца комплексна. У якасці такіх сродкаў кантролю і ацэнкі ведаў па дысцыпліне «Эколага-культурная дзейнасць» могуць выкарыстоўвацца вусныя апытанні падчас заняткаў, складанне рэфератаў па тэмах дысцыпліны і выступленне студэнтаў на семінарскіх і практычных занятках з распрацаванымі імі тэмамі.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендавана выкарыстанне праблемных, творчых заданняў (напрыклад, распрацоўка сцэнарыяў культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў экалагічнага напрамку з улікам псіхолага-педагагічных асаблівасцей канкрэтнага соцыуму).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Заданні для самастойнай работы студэнтаў

| Тэма | Колькасць гадзін | Форма справаздачы |
|---|---|---|
| **Тэма 1. Сутнасць і асноўныя прынцыпы эколага-культурнай дзейнасці**<br>Падрыхтаваць даклад, апіраючыся на наступныя навуковыя матэрыялы (альбо па іншых матэрыялах у адпаведнасці з тэмай):<br>*Самерсова, Н. В.* Экологическая культура личности: социокультурный аспект : моногр. / Н. В. Самерсова – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – С. 5–77. | 2 | навуковы рэферат (даклад) |
| **Тэма 2. Роля ўстаноў сацыякультурнай сферы ў арганізацыі эколага-культурнай дзейнасці**<br>Правесці і прадставіць кантэнт-аналіз публікацый у сродках масавай інфармацыі аб арганізацыі і правядзенні экалагічных мерапрыемстваў ва ўстановах сацыякультурнай сферы | 2 | калёквіум |
| **Тэма 3. Фарміраванне эколага-культурнай кампетэнтнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы**<br>Вызначыць сутнасць, крытэрыі і паказчыкі развіцця ўзроўняў эколага-культурнай кампетэнцыі спецыяліста сацыякультурнай сферы (нізкі, сярэдні, высокі) | 2 | педагагічная дыягностыка |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ЭКОЛАГА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2019. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,76. Ул.-выд. арк. 0,41. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ